У цэнтры размясцілася ПНЗ са сваім кандыдатам Г. Таразевічам. Да іх прыхільна ставіліся партыя Беларускі навукова-вытворчы кангрэс у асобах кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў Жодзіна і мясцовая суполка БСДГ.

На левым баку той жа палітычнай арэны ўладкаваліся «гладыятары» з Партыі камуністаў Беларусі, якія вылучылі кандыдатам у дэпутаты намесніка дырэктара невялікага мясцовага завода У. Міхейчыка. Яны таксама не чуліся самотнымі, бо карысталіся падтрымкай як гарадскіх, так і больш высокіх улад Беларусі.

Такім чынам, за чубы схапіліся тры палітычныя блокі: правы — БСП і БНФ, цэнтрысцкі — ПНЗ і яе саюзнікі, і нарэшце, лева-бюракратычны — ПКБ і партыя ўрада.

Перадвыбарчыя платформы кандыдатаў у асноўным адпавядалі праграмным накірункам іх партый. «Селянін» патрабаваў перадаць зямлю фермерам, камуніст змагаўся за сацыяльную справядлівасць. Г. Таразевіч абяцаў узрушыць Вярхоўны Савет, дамагчыся ад яго правядзення эканамічных рэформ, энергічных крокаў па выйсцю з крызіса.

Усе тры кандыдата адмоўна ставіліся да палітыкі Вярхоўнага Савета і патрабавалі датэрміновых выбараў. Што тычыцца цяперашняга ўрада, дык камуніст яго не крытыкаваў, цэнтрыст гаварыў аб сур'ёзных кадравых пераменах наверсе, а правы патрабаваў адстаўкі Кебіча.

Партыйная прыналежнасць кандыдатаў, ці прыхільнасць да нейкай палітычнай плыні ўспрымалася выбаршчыкамі спакойна: да шматпартыйнасці людзі, здаецца, ужо прызвычаіліся. Праўда, у цяжкім становішчы апынуўся прадстаўнік ПКБ. Пасля некалькіх праяў абструкцыі з боку ўдзельнікаў перадвыбарчых сходаў за «верность социалистическому выбору и коммунистическим идеалам» бедалага быў вымушаны хаваць партыйнае членства і рабіць націск на тутэйшае паходжанне, што, у рэшце рэшт, і дало яму неблагія вынікі на выбарах.

Праграмныя супярэчнасці партый і сапернікаў адыгралі другасную ролю ў перадвыбарчай бойцы. Найбольш моцныя кухталі адрасаваліся асабіста кандыдатам, а дакладней — адной асобе — Георгію Таразевічу. Супраць кандыдата ПНЗ вялі жорсткую барацьбу як левыя, так і правыя, як правячая бюракратыя, так і радыкальная апазіцыя.

Што тычыцца лева-бюракратычнага блока, дык тут усё проста. ПНЗ, не ўкрывала, што вылучае Г. Таразевіча не столькі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета (які неабходна распускаць), а на верхнія паверхі ўлады. На гэта намякала і цэнтральная прэса, калі пісала, што «Таразевіч вяртаецца ў вялікую палітыку». Не хавалі гэтага і саюзнікі Г. Таразевіча, якіх, хаця і з пэўнымі агаворкамі, можна назваць рэфарматарскай плынню сярод бюракратычнай багны ўладавых структур, і што яскрава засведчыў візіт С. Шушкевіча на БелАЗ за тры дні да выбараў.

Правячай бюракратыі было чаго сцерагчыся. Вяртанне на палітычную сцэну Г. Таразевіча, даўно выпаўшага з яе кола, магло прынесці ўсякія нечаканасці. Таму нейкі «Комитет рабочих и крестьян» звяртаўся да жодзінцаў: «Мы убедились, что организаторы сегодняшнего хаоса — Верховный Совет РБ, получит достойного коллегу в своих делах, они прекрасно ориентированы в этом хаосе и решают при этом свои задачи». Бязглуздзіца гэтай улёткі выклікана, відаць, не столькі неадукаванасцю членаў ананімнага «Комитета рабочих и крестьян», колькі вельмі ўжо далікатнай справай, якую ім даручылі: не дапусціць у парламент адступніка, былога партакрата Таразевіча, але не ўжываць пры гэтым антыбюракратычнай аргументацыі.

«Левакі« (двукоссе вызначае парадокс нашага часу: да левых вымушаны адносіць хапуг — прыхватызатараў з чыноўніцкага корпуса, але гэта тэма для іншай размовы), камуністы і мясцовыя ўлады не пазбавіліся старых звычак: адключалі гарадскую радыёсетку, калі выступаў кандыдат ПНЗ, выслалі міліцэйскі патруль супраць гандлевых кропак, арганізаваных мінчанамі ў Жодзіне ў дзень выбараў, адмовіліся прыняць дасланую на адрас гарвыканкама гуманітарную дапамогу для шматдзетных сем'яў. Ну што ж, бюракратыя тым і вартая, што ўмее сябе бараніць.

Больш пытанняў узнікае пры разглядзе тактыкі БНФ і БСП. Кіраўніцтва БНФ на прапанову ПНЗ заняць нейтральную пазіцыю на выбарах у Жодзіне станоўчага адказу не дало. Мясцовая ж суполка фронту падтрымала кандыдата БСП М. Антоненку і апантана выступіла супраць Г. Таразевіча. Практычна яна вяла перадвыбарчую прапаганду замест свайго слабейшага саюзніка — Беларускай сялянскай партыі.

Аргументацыя, праўда, і ў іх была даволі банальная. Таразевіч, пісалася ў пракламацыі рады БНФ, быў «юрыдычна першай асобай улады ў дзяржаве падчас Чарнобыльскай катастрофы». Варта адзначыць правалы памяці ў аўтараў, бо ў 1986 годзе беларускай дзяржавы не існавала, а Г. Таразевіч з'яўляўся адным з вышэйшых функцыянераў мясцовага самакіравання, ведаў і рабіў толькі тое, што зверху дазвалялі.

Цяжка было ўтаймаваць палітычныя і асабістыя эмоцыі старшыні сялянскай (таксама хочацца гэтую назву ўзяць у двукоссе) партыі Яўгену Лугіну. У тэлеперадачы і на сустрэчах з жодзінцамі напярэдадні выбараў ён заклікаў галасаваць за камуніста, толькі б не за Таразевіча, нават, забыўся пра свайго кандыдата ў дэпутаты. Можа дапякла чалавека свая няўдача на выбарах у Магілёўскай вобласці, можа свядома не жадаў перамогі цэнтрыстаў, якія маглі б пачаць наверсе перамены к лепшаму, але без яго, Я. Лугіна ўдзелу...

Як бы там ні было, але такі знамянальны факт, што левакі і правыя радыкалы рашуча выступілі супраць памяркоўнай апазіцыі, трэба асэнсаваць. Нельга гэтую з'яву вытлумачыць толькі высокімі амбіцыямі і нізкай палітычнай культурай некаторых беларускіх палітыкаў. Хутчэй за ўсё — гэта тактыка, якая ўкладваецца ў формулу: «Чым горш, тым лепш».

Фронт і Я. Лугін хацелі б давесці сітуацыю ў Беларусі да сацыяльнага выбуху, каб на яго хвалі ўзняцца да вяршын улады. Бюракратыя ж хацела ўтрымаць свае пазіцыі, а пагаршэння ўмоў жыцця спісаць на дэмакратаў, якія перабудавалі, развалілі, разламалі і г. д.

У якасці высновы могуць паслужыць вынікі галасавання сярод тых, хто прыйшоў на выбарчыя ўчасткі і аддаў свой голас на карысць аднаго з кандыдатаў: ПКБ у блоку з уладай атрымала 28,4 працэнтаў галасоў, блок БНФ — БСП — 13,6 працэнтау, ПНЗ — 58 працэнтаў.

Выбары лічацца неадбыўшыміся, бо ў іх удзельнічала 45,2 працэнтау выбаршчыкаў. Прадстаўнікі ПКБ і БСП на перамогу і не разлічвалі, яны адкрыта гаварылі, што ўдзельнічаюць у выбарах толькі дзеля павышэння рэйтынгу сваіх партый. А перадвыбарчую барацьбу ўвогуле вялі толькі з мэтай панізіць рэйтынг Таразевіча, ПНЗ. Аднак галасаванне адбылося. Каля 10 тысяч чалавек выказалі свае палітычныя сімпатыі. Канструкцыйная апазіцыя перамагала з вялікім адрывам ад левых і правых радыкалаў.

Леанід ЛОЙКА, намеснік старшыні ПНЗ.

ПИСЬМО К СЪЕЗДУ

ВЫБИРАЮ ПАРТИЮ

Мы переживаем трудное время и хочется верить, что трудности эти временные, преходящие,что жизнь, наконец-то, стабилизируется и нас ожидает возрождение.

И очень многое здесь зависит от действий политических сил и нашей поддержки той или иной из них.

Сейчас каждый из нас должен определиться какой партии отдать предпочтение, чья программа наиболее реальна и осуществима, наиболее соответствует задачам стабилизации экономической и политической ситуации в республике.

Я внимательно изучил документы ряда партий и движений, действующих сегодня в Беларуси. Более близки и понятны мне оказались идеи партии Белорусский научно-производственный конгресс, Партии народного согласия.

Последней я отдаю предпочтение. Почему? ПНС не только ведет справедливую критику правительства и Верховного Совета РБ, но и разработала на своем Учредительном съезде программу вывода республики из экономического и политического тупика. Она зовет народ к согласию, к единству действий всех прогрессивных сил общества во имя спасения Отечества. Определиться в выборе партии — личное дело каждого.

Разъясняя документы Партии народного согласия среди сослуживцев, знакомых и друзей, я услышал и такие отзывы:

Либо Софья, пенсионерка: «Я всю жизнь кому-то верила: Ленину, Сталину, Богу. Хочу и теперь во что-то верить, жить без веры нельзя. ПНС с ее идеями за стабилизацию обстановки в республике. И дай Бог, чтоб их программа осуществилась.»

Кравченко Галина, инженер: «Большая часть жизни прожита и, в общем-то, неплохо. Я волнуюсь за судьбу дочери. Государство должно обеспечить нормальную жизнь своим гражданам. А Партия народного согласия как раз и предлагает такую программу действий правительству и Верховному Совету. Хочу видеть среди депутатов представителей этой партии и на выборах отдам свой голос за них.»

Слепченко Ася, служащая: «ПНС — за экономические реформы, за стабильность в обществе, думает о судьбе народа. Надо же делать что-то существенное. Если народ увидит это «существенное», он и поддержит ту партию, за которой будущее страны.»

Скринник Александр, рабочий: «Работать, чтоб зарабатывать на нормальную жизнь. А мы работать умеем. ПНС призывает к единству, к согласию, а это мне, да и не только мне, важнее всего. Мы устали от неразберихи в стране.»

Ковзан Андрей, студент: «Хочу стабильности и спокойствия, уверенности в завтрашнем дне. А сегодня этого нет. ПНС несет хорошие идеи, но этого мало, надо их воплотить в жизнь. От правительства и Верховного Совета слышим только обещания. Неужели у нас в обществе нет такой силы, способностей изменить жизнь к лучшему? Хочу видеть такой силой Партию народного согласия.»

Вероятно, каждый из нас сделает свой выбор, определит свою политическую ориентацию, будет содействовать той или иной партии. Жить в обществе и быть вне политики сегодня нельзя.

Я свой выбор сделал.

Александр КОРОТКЕВИЧ,

преподаватель политэкономии индустриально-педогогического техникума.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

«НИТЬ АРИАДНЫ» В РУКАХ ПНС?

АЛЕКСЕЙ ГАВУРА

Программа выхода Республики Беларусь из кризиса стоит в центре внимания общественности, всех образовавшихся в последние годы политических партий и группировок.

В этой связи интерес вызывают тезисы «Нить Ариадны» — о путях выхода республики из кризиса, разработанные программной комиссией исполкома ПНС («Згода», номер 12, 1993 г.).

Особо обращает на себя внимание первый пункт — об условиях выхода республики из кризиса, его основной смысл в достижении общенационального согласия по проблеме изменения экономического и общественно-политического уклада Беларуси. Действительно — это исходное условие, без которого движение по пути реформ просто-напросто невозможно. Как правда и то, что избранный в старые времена Верховный Совет и сформированное им правительство не в состоянии обеспечить подобные условия. Они не отвечают их интересам.

Весьма симптоматично, что исполком ПНС ратует за переговоры, консультации с тем, чтобы избежать конфронтации, сохранить политическую и социальную стабильность, и выйти на взаимоприемлемое решение острых проблем: принятия конституции, реконструкции хозяйственного механизма, обузданию инфляции, оздоровлению финансовой системы, проведению разгосударствления собственности, пресечению дикой прихватизации, предотвращению массовой безработицы.

Не обойдены стороной проблемы сельского хозяйства, защита его производителей от инфляции с целью создания условий для повышения рентабельности сельскохозяйственного производства, защите его от конкуренции западноевропейских фермеров, самообеспечения республики продуктами питания.

Самостоятельная внешнеполитическая концепция, точный выбор приоритетов, укрепление независимости республики, равноправие во всех соглашениях с Россией, активизация ее политики в Центральной Европе — обеспечат Беларуси устойчивое положение в системе международных отношений.

Наряду с условиями по реализации данной программы нужна и соответствующая финансовая база, т. е. определенные источники ее денежного обеспечения. В этой связи считаю возможным добавить шестой пункт к тезисам: обеспечить проводимые мероприятия финансовыми источниками за счет внутренних ресурсов при более экономичном расходовании госбюджета.

Экономию финансовых ресурсов можно осуществить за счет: 1) сокращения финансирования государственного аппарата не менее чем в пять раз; 2) сокращения армии до 40 — 50 тыс. человек; 3) внутреннего займа распродажи акций; 4) надежных гарантий капиталовложений населения, что послужит стимулом для возвращения из иностранных банков денежных средств граждан республик, предприятий. Эти меры создадут достаточно денежных средств, чтобы за 2 — 3 года осуществить замену устаревшего оборудования на предприятиях, сменить технологию, создать, не игнорируя при этом и иностранных инвестиций, инфраструктуру во всех областях в сельскохозяйственном производстве.

Мероприятия, предложенные Программной комиссией исполкома ПНС, при весомой поддержке их достаточными финансовыми ресурсами, несомненно, смогут послужить путеводной нитью при выходе Беларуси из социально-экономического кризиса. В противном случае нить может оборваться и республику нашу, как некогда Ариадну, вынесет на пустынный остров Наксос.

ПАМЯТИ ТОВАРИЩА

Скоропостижно скончался Алексей Иванович Гавура, кандидат экономических наук, пенсионер, член Партии народного согласия. Коллеги, друзья по партии скорбят о безвременной смерти Алексея Ивановича и выражают глубокое соболезнование его родным и близким.

ПНЗ: ХРОНІКА

Чарговае пасяджэнне Савета ПНЗ 11 снежня разгледзела пытанні арганізацыйнага ўмацавання партыйных арганізацый, падрыхтоўкі да магчымай выбарчай кампаніі, сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў Беларусі і стварэння аб'яднання «Сацыял-дэмакратычны цэнтр». З дакладамі выступілі адпаведна П. І. Брыгадзін, Л. В. Лойка, Г. Дз. Карпенка і А. С. Кароль.

Дакладчыкі і выступіўшыя ў спрэчках прамоўцы вызначылі канкрэтныя першачарговыя меры па далейшаму ўмацаванню існуючых партыйных арганізацый і стварэнню новых, аказанню ім неабходнай практычнай дапамогі, павышэнню іх дзеяздольнасці.

Прынята рашэнне тэрмінова зарэгістраваць усе арганізацыі ў мясцовых органах улады ў адпаведнасці са Статутам ПНЗ і існуючым заканадаўствам. Значная ўвага была ўдзелена распрацоўцы передвыбарнай платформы партыі, стварэнню груп пры пярвічных і рэгіянальных арганізацыях груп з задачай адаптацыі агульных прынцыпаў платформы да мясцовых патрэб, азнаямленні насельніцтва з пазіцыяй партыі.

Грунтоўна прааналізавана сацыяльна-палітычная сітуацыя ў рэспубліцы. Адзначана рэзкае падзенне жыццёвага ўзроўню насельніцтва з-за нядатнай палітыкі ўрада, няздольнасці яго праводзіць эканамічныя і палітычныя рэформы, іх супраціўлення наспеўшай патрэбе рэарганізацыі структур Саўміна, правядзення датэрміновых выбараў Вярхоўнага Савета.

Удзельнікі сходу былі праінфармаваны аб намаганнях выканкама па стварэнню сацыял-дэмакратычнага цэнтру, у які маркуюць увайсці ПНЗ, БСДГ, БНВК і ФПБ. Праводзяцца кансультацыі з кіраўніцтвам гэтых арганізацый, распрацоўваюцца асноўныя прынцыпы іх аб'яднання.

Савет падтрымаў рашэнні рэспубліканскай канферэнцыі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі ад 9 снежня 1993 г. аб поўным і няўхільным выкананні Закона «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» і аб правядзенні забастоўкі ў студзені 1994 г.

У прынятай пастанове падкрэсліваецца, што павышэнне заработнай платы і індэксацыя яе ў адпаведнасці са зменнямі цэн павінна праводзіцца не толькі работнікам адукацыі і навукі, але і работнікам аховы здароўя, культуры, другіх катэгорый інтэлігенцыі.

Разгледжаны арганізацыйныя пытанні. Намеснікамі Старшыні ПНЗ абраны Пётр Брыгадзін, Аляксей Кароль, Леанід Лойка. Уведзены ў склад Савета Уладзімір Крукоўскі (г. Віцебск).

* * *

Пасяджэнні выканкома 8, 10 і 19 лістапада былі прысвечаны абмеркаванню прапановы кіраўніка ўрада В. Ф. Кебіча Г. Дз. Карпенка заняць пасаду віцэ-прэм'ера па пытаннях эканомікі. У выніку вострых і нярэдка даволі эмацыянальных дыскусій, правядзення кансультацый з кіраўнікамі Вілейскай, Гродзенскай, Жлобінскай, Клімавіцкай, Мінскай, Мозырскай, Нясвіжскай, Смалявіцкай арганізацый, кіраўніцтвам шэрагу палітычных партый дасягнута дамоўленасць рэкамендаваць Старшыні Савета ПНЗ Г. Карпенка даць згоду на заняцце пасады віцэ-прэм'ера, але толькі на пэўных умовах.

Па-першае, неадкладнай рэарганізацыі ўсяго блока эканамічных структур Савета Міністраў, замкнёных на рэформы. Па-другое, абнаўленне іх кадравага складу. Па-трэцяе, надзяленне віцэ-прэм'ера ўсей паўнатой праў у сферы яго функцый. Па-чацвёртае, дакладна вызначаных накірункаў рэфармавання эканомікі.

* * *

Мінскі гарадскі Савет ПНЗ на пасяджэннях 11 і 18 лістапада засярodзіў увагу па падрыхтоўцы неабходных дакументаў для рэгістрацыі гарадской і раённых арганізацый у адпаведных выканкомах Саветаў народных дэпутатаў, а таксама для падрыхтоўкі сходу гарадской арганізацыі, прысвечанага абмеркаванню эканамічнай сітуацыі, якая склалася ў выніку бязмежнага павышэння цэнаў на прадукты харчавання і прамысловыя тавары.

* * *

НАСТАЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ — ЗА ЗАБАСТОЎКУ

За яе прагаласавалі 342 дэлегата з 364 рэспубліканскай канферэнцыі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Беларусі, якая адбылася 9 снежня 1993 года ў г. Мінску. Што ж прымусіла настаўнікаў і навукоўцаў пайсці на такі крок і назначыць на 12 студзеня будучага года забастоўку. Адказ просты: дзеянні ўрада, які не жадае выконваць Закон «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» і пастановы Вярхоўнага Савета аб гарантаванай заработнай плаце ў адпаведнасці са змяненнямі індэкса цэн. Яна павінна складаць не менш 100 працэнтаў педагагічным работнікам і 150 працэнтаў прафесарска-выкладчыцкаму саставу ад заработнай платы служачых у прамысловасці ў мінулым квартале.

У дакладзе кіраўніка прафсаюзаў адукацыі і навукі рэспублікі Т. І. Чобатавай, у выступленнях дэлегатаў канферэнцыі з вялікім непакоем гаварылася аб заганнай палітыцы ўрада і Вярхоўнага Савета ў адносінах да адукацыі і навукі. Яны імкнуцца вырашаць фінансавыя пытанні за кошт інтэлігенцыі, давялі яе да жабрацтва.

Іх палітыка аб'ектыўна накіравана на разбурэнне сярэдняй і вышэйшай школы, а таксама навукі. Нельга не пагадзіцца з дырэктарам СШ N1 г. Слоніма В. А. Бялякіным, што калі і далей будзе праводзіцца цяперашняя палітыка ўрада і Вярхоўнага Савета ў адносінах да адукацыі, будучыні ў нас не будзе. Сёння сярэднюю і вышэйшую школу, навуковыя ўстановы пакідаюць лепшыя работнікі: выязджаюць за мяжу, пераходзяць ў камерцыйныя і іншыя структуры, дзе заробак ў некалькі разоў вышэйшы.

Многа крытычных стрэл было выпушчана на адрас урада і Вярхоўнага Савета, амаль у кожным выступленні гучалі патрабаванні іх адстаўкі і правядзення датэрміновых выбараў.

Ці прыслухаюцца ўлады да голасу адчаю, ці задумаюцца аб будучыні інтэлігенцыі (а можа яна зусім не патрэбна грамадству і дзяржаве?) і павернуцца да яе тварам? Верыцца з вялікай цяжкасцю. Не верыць ў гэта настаўнікі, навукоўцы, як і ўся інтэлігенцыя.

Іван Стадуб.

ТАКОЕ ШМАТПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Кіраўніцтва Партыі народнай згоды, партыі Беларускі навукова-вытворчы кангрэс, Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады і Федэрацыі прафсаюзаў правялі шэраг кансультацый аб стварэнні аб'яднання «Сацыял-дэмакратычны цэнтр».

Распачата падрыхтоўчая праца па яго стварэнню. Узгадняюцца прынцыпы аб'яднання, яго арганізацыйных форм, накірункаў сумеснай дзейнасці.

ЗВАРОТ АРГАНІЗАЦЫЙ-УДЗЕЛЬНІКАЎ КАНСУЛЬТАЦЫЙНАЙ НАРАДЫ ПАТРЫЯТЫЧНА-ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ ДА ДЭПУТАТАЎ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Шаноўныя дэпутаты! Працэс палітычных і эканамічных рэформаў ідзе ў вельмі складанай для нашай краіны сітуацыі. Для ўсіх нас вельмі важна ў гэты цяжкі час захаваць законнасць у грамадстве, забяспечыць перайманае развіццё і рэфармаванне ўсіх асноўных дзяржаўных структур. Шмат што ў вырашэнні гэтай задачы залежыць ад гатоўнасці праваахоўных органаў і іншых сілавых структур служыць перш за ўсё закону і дзяржаве. Але тыя працэсы, якія ўсе мы назіраем вакол гэтых структур выклікаюць сур'ёзную заклапочанасць і насцярожваюць грамадства. Перш за ўсё мы маем на ўвазе стварэнне непрадугледжанага Канстытуцыяй і незацверджанага Вярхоўным Саветам і непадкантрольнага яму Дзяржсакратарыята па барацьбе са злачыннасцю і нацыянальнай бяспецы, які спрабуе, па сутнасці, кіраваць Міністэрствам унутраных спраў і Міністэрствам абароны. І нават умешваецца ў справы Камітэта дзяржаўнай бяспекі, падпарадкаванага Вярхоўнаму Савету. З боку кіраўніцтва Дзяржсакратарыяту не аднаразова гучалі не абгрунтаваныя заявы, якія наносілі шкоду адносінам Рэспублікі Беларусь з іншымі дзяржавамі, у тым ліку з Расіяй і ЗША.

Самую сур'ёзную заклапочанасць выклікае таксама незаконнае стварэнне спецслужбаў, дзеянне якіх не прадугледжана існуючымі законамі і знаходзіцца па-за кантролем Вярхоўнага Савета. Да чаго гэта можа прывесці паказалі падзеі 9 лістапада, калі ў грамадстве абсалютна, «на роўным месцы» была створана крызісанебяспечная сітуацыя, і краіна аказалася на мяжы дзяржаўнага перавароту і грамадзянскай вайны.

На вялікі жаль, камісія Вярхоўнага Савета па пытаннях нацыянальнай бяспекі, абароны і барацьбы са злачыннасцю паказала няздольнасць усталяваць дзейсны кантроль за небяспечнымі працэсамі вакол сілавых структур. Прычына гэтага найперш у тым, што членамі гэтай камісіі з'яўляюцца асобы, якія адначасова прадстаўляюць кантралюемыя ею органы.

Небяспечнасць сітуацыі прымушае нас звярнуцца да Вас, шаноўныя дэпутаты, з наступнымі прапановамі.

1. Абмеркаваць на пасяджэнні сесіі пісьмо старшыні КДБ і міністра МУС, пытанні і факты выкладзеныя ў ім.

2. Стварыць дэпутатскую камісію па расследванню дзейнасці Дзяржсакратарыята, а таксама абставін, якія прывялі да стварэння пагрозы крызісу, а таксама абгрунтаванасці апошніх перамяшчэнняў у МА і МУС.

3. Разгледзець пытанне аб мэтазгоднасці захавання ў структуры Саўміна Дзяржсакратарыята па барацьбе са злачыннасцю і нацыянальнай бяспецы, як незаконнай і небяспечнай для стабільнасці ў краіне структуры.

На наш погляд, гэтыя захады дазволяць пазбегнуць далейшага ўцягвання сілавых структур у палітычную барацьбу, перапыніць небяспечны працэс стварэння пад выглядам дзяржаўных, а па сутнасці, незаконных сілавых структур, арыентаваных на працэсы пэўных палітычных груповак, забяспечыць законнасць і парадак у грамадстве ў складаны пераходны перыяд.

Партыя народнай згоды
Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада
Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі
Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць
Таварыства Беларускай мовы
Беларускае згуртаванне вайскоўцаў
Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі
Беларуская сялянская партыя

ЕСТЬ ЕЩЕ ОДНА ПАРТИЯ

Состоялся учредительный съезд Партии труда. Ее создали представители профсоюзного движения из ряда городов Беларуси.

В числе делегатов — рабочие, служащие, профсоюзные лидеры предприятий Минска, Витебска, Бреста, Бобруйска, Борисова, Осиповичей. Руководящим органом определен Совет партии, часть мест в котором была предложена ряду профсоюзных лидеров республики. Другая часть осталась для представителей предприятий, организаций республиканской периферии — если они вознамерятся примкнуть к рядам партии. Председателя партии пока решено не избирать.

Как сообщил член вновь избранного Совета, председатель Совета профсоюза работников автомобильного и сельскохозяйственного машиностроения Александр Бухвостов, программа Партии труда имеет социал-демократическую направленность. Новая политическая организация намерена защищать интересы не только рабочих, но и служащих, учителей, врачей, журналистов, продавцов и т. д. — всех, кто живет на зарплату и попадает под определение «наемный работник».

БЕЛАРУСЬ — ПОЛЬШЧА: РУКУ НА ДРУЖБУ

ПРАДСТАЎНІКІ ТАВАРЫСТВА «БЕЛАРУСЬ — ПОЛЬША», САЮЗА ПАЛЯКАЎ БЕЛАРУСІ, ТАВАРЫСТВА «ПОЛЬШЧА — БЕЛАРУСЬ» І БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНАГА ТАВАРЫСТВА

21 лістапада 1993 года правялі сустрэчу ў Гродне. Абмеркаваўшы стан нацыянальных адносін у Беларусі і Польшчы, а таксама некаторыя пытанні міждзяржаўных беларуска-польскіх адносін, яны прынялі сумесную заяву, у якой зазначылі, што ТБП, СПБ, ТПБ і БГКТ:

— садзейнічаюць развіццю ўсебаковага добрасуседскага ўзаемадзеяння Беларусі і Польшчы,

— умацоўваць спрыяльны марэльна-палітычны клімат у адносінах паміж беларусамі і палякамі ў Беларусі і ў Польшчы;

— пашыраюць веды і ўзаемнае шанаванне культуры і гістарычныя традыцыі абодвух народаў;

— супрацьдзейнічаюць кожнай спробе ўскладніць міждзяржаўныя і міжнацыянальныя адносіны ў нашых краінах.

Удзельнікі чатырохбаковай сустрэчы ў мэтах пашырэння і паглыблення беларуска-польскіх сувязей ва ўсіх галінах жыцця, абмену дасведчаннямі ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем, узаемнага ўзбагачэння культур нашых народаў звярнуліся да ўлад Беларусі і Польшчы з заклікам:

1) Наладзіць належным чынам інфармацыйны абмен паміж Беларуссю і Польшчай, у тым ліку:

— трансляцыю польскага тэлебачання на Беларусь і беларускага — на Польшчу;

— дастаўку і рэалізацыю праз гандлевую сетку польскай прэсы ў Беларусі і беларускай у Польшчы;

— абмен інфармацыйнымі матэрыяламі паміж рэдакцыямі СМІ Беларусі і Польшчы.

2) Прадугледзець у дзяржаўным бюджэце абедзвюх краін сродкі для культурных сувязей: гастроляў творчых калектываў, правядзення мастацкіх выстаў, кінафестываляў, дней польскай культуры ў Беларусі, беларускай — у Польшчы.

3) Адкрыць у Мінску Польскі інфармацыйна-культурны цэнтр і ў Варшаве — Беларускі інфармацыйна-культурны цэнтр.

Удзельнікі сустрэчы прыйшлі да высновы аб карыснасці кантактаў беларускіх і польскіх грамадскіх арганізацый, дзейнічаючых у сферы беларуска-польскіх міждзяржаўных і міжнацыянальных адносін і вырашылі зрабіць іх рэгулярнымі, праводзіць не меньш, чым два разы ў год, па чарзе: у Гародні, Беластоку, Мінску, Варшаве.

УЛАДА: СТРУКТУРА І МЕХАНІЗМ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ

ШКОЛА ПАЛІТЫКІ

Паняцце ўлады, як і сама ўлада, узнікае паміж людзьмі альбо групамі людзей, грамадствам і яго часткамі, гэта значыць, паміж суб'ектамі, надзеленымі свядомасцю, воляй і здольнасцю да дзейнасці. Да суб'ектаў палітычнай улады адносяць: розныя сацыяльныя супольнасці і групы, дзяржаву, палітычныя партыі і арганізацыі, групавое і індывідуальнае лідэрства і інш. Такім чынам, суб'ектам улады можа быць як індывід, так і калектыўна арганізаваныя асобы, а таксама розныя ўстановы і арганізацыі. Значыць, суб'екты ўлады не роўназначны. Сярод іх выдзяляюцца першасныя і другасныя. Да першасных належаць вялікія сацыяльныя групы (класы, сацыяльныя слаі, этнічныя супольнасці). Другасныя суб'екты ўлады — гэта розныя палітычныя інстытуты, установы і іх органы, а таксама малыя сацыяльныя групы і асобы, здзяйсняючыя волю вялікіх грамадскіх груп.


КІРУЮЧАЯ ЭЛІТА

З пункту гледжання многіх палітолагаў, людзі, якія маюць уладу, ва ўсякім грамадстве ўяўляюць сабой меншасць, якая азначаецца як кіруючая эліта. Тэрмін «эліта» у перакладзе на беларускую мову з французскай абазначае «лепшы», «адборны». У сучаснай паліталагічнай літаратуры адрозніваюцца паняцці эліты кіруючай і эліты палітычнай. Паняцце кіруючай эліты з'яўляецца больш шырокім. Яно ўключае ў сябе асоб, прымаючых рашэнні, якія аказваюць уздзеянне на функцыяніраванне ўсяго грамадства. Асноўным, вядучым слоем у кіруючай эліце, у многім вызначаючым прыняцці палітычных рашэнняў, з'яўляецца эканамічная эліта. Гэтую групу складаюць буйныя ўласнікі, уладальнікі прамысловых карпарацый, банкаў, страхавых кампаній, гандлёвых фірм і г. д. Менавіта, валоданне ўласнасцю, эканамічнай уладай вызначае яе ролю і месца ў грамадстве і ўздзеянне на рашэнні, якія прымаюцца кіруючай элітай.

Другой па значэнню сацыяльнай групай у кіруючай эліце з'яўляецца палітычная эліта. Да яе адносяць асоб, якія займаюць найбольш высокія пасады ў дзяржаўнай бюракратычнай машыне, што дазваляе палітычнай эліце ажыццяўляць уладныя функцыі. У яе ўваходзяць як прадстаўнікі самага высокага ўзроўня ўлады (напрыклад, ружэнне прэзідэнта, прэм'ер-міністраў), так і кіраўнікі вядучых палітычных інстытутаў (кіраўнікі міністэрстваў, ведамстваў, партыйных фракцый у парламенце і г. д.).

Наступны элемент кіруючай эліты — бюракратычная або адміністрацыйная эліта. Прадстаўнікі яе здзяйсняюць кантроль за работай розных адміністрацыйных органаў, камісій і саветаў, дзе рыхтуюцца і праз якія праходзяць, рэалізуюцца розныя рашэнні.

Неад'емным элементам кіруючай эліты з'яўляецца ваенна-бюракратычная эліта. Ступень уздзеяння гэтай групы на палітычнае жыццё ў многім вызначаецца ўзроўнем



мілітарызацыі той ці іншай краіны і характарам яе палітычнага рэжыму.

І яшчэ адзін слой у кіруючай эліце — ідэалагічная ці інфармацыйная эліта. Да яе адносяць вядучых прадстаўнікоў навукі, культуры, рэлігіі, адукацыі, якія выконваюць у грамадстве функцыю ідэалагічнага ўздзеяння, фарміравання светапоглядных пазіцый. Асабліва вялікі ўплыў на палітычны працэс аказваюць элітныя групы, якія дзейнічаюць ў сферы масавай інфармацыі.

ВІДЫ ПАЛІТЫЧНАЙ УЛАДЫ

Тыпалогія ўлады ў многім залежыць ад адзнак і крытэрыяў, якія бяруцца для падстаў яе класіфікацыі. Па сферы рэалізацыі і аб'ёму прэрагатыў палітычная ўлада падраздзяляецца на дзяржаўную і асацыятыўную (партыйная, групавыя, мясцовай адміністрацыі і г. д.). У залежнасці ад уладных структур выдзяляюцца: улада заканадаўчая, выканаўчая і судовая. Па суб'екту або носьбіту ўлада можа быць: класавая, народная, парламенцкая, урадавая, асабістая. Па структуры кіруючага суб'екта ўлада дыферэнцыруецца на аднаасобную (самадзяржаўную) і паліархічную, утворанную групай — алігархіяй. Па сацыяльна-палітычнай прыродзе і структурнай арганізацыі носьбіта ўлада бывае манархічная і рэспубліканская, па рэжыму кіравання — дэмакратычная, аўтарытарная, дэспатычная, таталітарная і г. д.

УЛАДА ЯК СІСТЭМА

Палітычная ўлада, як і другія грамадскія з'явы, уяўляе сабой сістэму, якая часта называецца механізмам палітычнай улады. У самым шырокім сэнсе гэты механізм уключае ў сябе такія моманты, як арганізацыйныя формы палітычнай улады, шляхі, спосабы і сродкі яе ажыццяўлення. Структура гэтага механізма ў палітычнай літаратуры раскрываецца па-рознаму. Адны разумеюць пад ім такія элементы, як кіраўніцтва, кіраванне, арганізацыя і кантроль.

Другія выдзяляюць блокі элементаў: 1. Элементы-арганізацыі: дзяржава, дзяржаўная ўлада і палітычныя партыі. 2. Элементы-нормы: палітычнае права, прававая псіхалогія, законнасць і правапарадак, прававы рэжым, прававая культура і г. д. 3. Элементы-дактрыны: прававая ідэалогія, рэлігійная ідэалогія, палітычная ідэалогія. Думаецца, што такі падыход таксама правамерны.

Галоўнае, аднак, заключаецца ў тым, як улада ажыццяўляецца. Тут прынцыпова важна звярнуць увагу на два асноўныя моманты: на працэс прыняцця рашэнняў і на працэс іх рэалізацыі. У першым выпадку размова ідзе аб выбары палітычнай стратэгіі, доўгатэрміновых і бліжніх мэтах з улікам растаноўкі палітычных сіл грамадства, інтарэсаў сацыяльных, этнічных і рэлігійных груп. Заўважым, што ў доўгатэрміновым прагнозе вынікі праяўляюцца праз дзесяцігоддзі і часта не заўсёды чаканыя. Дастаткова ўспомніць аб першапачатковых надзеях на сацыялістычнае грамадства і аб выніках, якія праявіліся праз дзесяцігоддзі.

У прабляме прыняцця і рэалізацыі рашэнняў неабходна звярнуць увагу на ролю тых асоб, якія быццам бы не звязаны з палітычнай уладай.

Прынамсі, на так званае лоббі, на групы націску, якія ўжо даўно сталі складанай часткай палітычнага жыцця грамадства і ў многім забяспечваюць дэмакратычны характар функцыяніравання палітычнага механізма.

ФУНКЦЫІ ПАЛІТЫЧНАЙ УЛАДЫ

Да іх адносяць: 1) фарміраванне палітычнай сістэмы грамадства, арганізацыю яго палітычнага жыцця, палітычных адносін паміж дзяржавай і грамадствам, грамадскімі групамі, класамі, асацыяцыямі, палітычнымі інстытутамі, апаратам і органамі дзяржаўнага кіравання, партыямі, грамадзянамі і г. д., кіраванне справамі грамадства і дзяржавы на розных узроўнях; 2) кіраўніцтва органамі ўлады і палітычнымі, а таксама не-палітычнымі працэсамі; 3) кантроль палітычных і іншых адносін і ў канчатковым выніку стварэнне азначанага, характэрнага для таго ці іншага грамадства тыпа кіравання, палітычнага рэжыма і дзяржаўнага ладу (манархічнага, рэспубліканскага), адкрытага ці закрытага, замкнутага, адгароджанага ад дзяржаў (аўтаркічнага) грамадства, уласцівай дадзенай дзяржаве палітычнай сістэмы, адпаведных ёй палітычных адносін і іншых палітычных характарыстык грамадства.

Актуальным пытаннем тэорыі палітычнай улады з'яўляецца праблема яе падзела на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Ідэя падзелу ўлад упершыню была выказана ў XYII стагоддзі Дж.Локам. Больш дэталёва яна была распрацавана ў XYIII стагоддзі Ш. Мантэск'ё, які стварыў канцэпцыю падзелу ўлад у сучасным яе выглядзе. У марксісцкай тэорыі ідэя падзелу ўлад традыцыйна крытыкавалася. К. Маркс і У. Ленін былі прыхільнікамі адзінства заканадаўчай і выканаўчай улады. Здзейсненая на практыцы ў былым СССР гэта ідэя прывела да негатыўных вынікаў, канцэнтрацыю ў руках выканаўчых органаў вялізарнай улады самавольства і беззаконнасці.

У дэмакратычным жа грамадстве найбольш аптымальным з'яўляецца падзел улады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую, якія кантралююць і ўраўнаважваюць адна адну сістэмай «стрымак» і «процівag». Гэта стварае гарантыі супраць злоўжыванняў.

ЛЕГІТЫМНАСЦЬ УЛАДЫ

Важнай умовай выканання ўладай свайго прызначэння з'яўляецца яе легітымнасць (ад лат. — законнасць). Легітымная ўлада асноўваецца на прызнанні права яе носьбітаў вызначаць нормы паводзін другім індывідам. Але легітымнасць не абазначае падтрымкі ўсімі праводзімага палітычнага курса, не выключае яго крытыкі.

Якія ж крытэрыі легітымнасці ўлады? Па гэтаму пытанню існуюць два асноўныя пункты гледжання. Згодна першаму, ліберальна-дэмакратычнаму, легітымнай можна лічыць толькі такую ўладу, якая сфарміравана ў працэсе дэмакратычных працэдур. Улада, устаноўленая ў выніку насілля, не з'яўляецца законнай. Паводле другому, прагматычнаму, галоўнае не толькі ў выбарнасці ўлады, але і ў яе здольнасці авалодаць складанай сітуацыяй у краіне, умець надтрымліваць у грамадстве парадак. З пазіцыі прыхільнікаў гэтага падыхода легітымнай можна лічыць і тую ўладу, якая складваецца ў працэсе рэвалюцыі, калі яна нясе грамадству стабільнасць і парадак.

Адам МЕЛЬНІКАЎ,

кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.

У СОСЕДЕЙ

ПИСЬМО ИЗ ЛАТВИИ В ГАЗЕТУ «ЗГОДА»

Старые связи разрушены, новые создаются с трудом, уровень производства падает, жизненный уровень понижается — такова ситуация, кажется, во всех бывших соцреспубликах. Латвия — не исключение.

Большие госпредприятия — монополисты, особенно в пищевой промышленности. Хлеб дорогой, тем не менее, урожай убран не весь, да и убранный крестьянин чаще всего не может продать, многие фермеры зерно собираются скармливать скоту, наблюдается, так сказать, возвращение к натуральному хозяйству. Склады промпредприятий наполнены никому не нужной продукцией, задерживается выдача зарплаты. На молочных комбинатах накапливается сливочное масло, из-за высокой себестоимости нет спроса. Покупатель предпочитает дешевый финский маргарин.

Латвия обросла частными торговыми лавками. Миловидные девушки, будь это в Резекне или Лиепае, предлагают ярко упакованный западный товар — твиксы, сникерсы и т. п. Да, лежит и колбаса разносортная, но рядовой покупатель чаще всего и вкус ее забыл. Экспортируем, должно быть, добротный товар: рыбу, древесину, кожу, дичь, микроавтобусы. Получаем товар — не проданный на Западе. Например, химический польский лимонад почти полностью вытеснил местные напитки.

